

## Міхась Міхайлавіч БОЛСУН

Нарадзіўся 23 лютага 1942 года ў вёсцы Балсуны Чачэрскага раёна. Скончыў факультэт педагогікі і методыкі навучання Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (цяпер імя Ф. Скарыны) і аддзяленне журналістыкі Мінскай ВПШ. Працаваў рабочым саўгаса, загадчыкам бібліятэкі, настаўнікам. З 1965 года – на журналісцкай працы. Быў намеснікам рэдактара чачэрскай райгазеты, галоўным рэдактарам буда-кашалёўскай раёнкі. Доўгі час працаваў старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела ў Гомельскім абласным тэлерадыёаб'яднанні. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў. Выпусціў паэтычныя зборнікі «Яблыня ў фаце», «Там, дзе задумлівы Сож», «Спатканне з поўняй», «Над сузор'ем дабрыні», дакументальную кнігу «Чачэрскі след у навуцы». Укладальнік паэтычнага зборніка «Далоні цёплыя зямлі». Лаўрэат міжнароднай прэміі Баяна, абласнога літаратурнага конкурсу імя Івана Мележа. Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя К. Тураўскага, Анатоля Грачанікава. Узнагароджаны знакам СПБ «За уклад у беларускую літаратуру». Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровы грамадзянін Чачэрскага раёна, уладальнік Ганаровай граматы Акадэміі навук Беларусі. Жыве ў Гомелі.

### МАЯ ЛЮБОЎ...

За свіст шпакоў у веснім садзе,
За пошчак звонкі салаўя,
За сінь лясоў на даляглядзе –
Мая любоў табе, зямля!
За мужнасць ратную і працу,
За хлебасольства ад душы,
За крылы думак, спраў багацце,
Дабро, спагаду без мяжы,
За водар летні ў лузе стога,
За поціск шчырае рукі,
За слова цёплае ў дарогу –
Мая любоў вам, землякі!

***

Мая душа не прагне славы,
Пакуль рака жыццё цячэ,
Мне ў радасць людзі, нівы, травы,
Дарога, што вядзе ў Чачэрск.

Там мой выток,
Рака-калыска,
Да болю родная зямля.
Паклон абсягам шчыры, нізкі,
Дзе вершы ў сэрцы я люляў!

Няхай ляціць над краем слова,
Нібыта птах у сіняву,
Не веру ў шчасныя падковы,
Я тым шчаслівы, што жыву!

## НЕ ДАЙ САБЕ ПРАВА

Не дай сабе права забыць той куток,
Дзе зведаў пяшчоту матулі,
Дзе першы зрабіў у жыцці сваім крок,
І голас твой людзі пачулі.

Не дай сабе права забыць карані.
З якога атожылак роду?
І хто бараніў нашы светлыя дні,
Любіў, нібы сонца, свабоду.

Там сёння красуюць густыя жыты,
П'яніць востры водар жывіцы,
І месяц, і россыпы зор залатых
Закінуты з неба ў крыніцу.

Не дай сабе права забыць прыгажосць,
Якою Радзіма багата,
Дзе ў радасць з душою адкрытаю госць,
Дзе думкам і песням крылата.

## ГІМНАСЦЁРКА

Прымяраў я яе
З трапяткім хваляваннем,
Калі ў войска пайшоў,
Каб Радзіме служыць.
І зялёным было
На плацу тое ранне,
Хоць сняжок навакол
Матылямі кружыў.





Прыгадаў, як глядзіць
Бацька шчыра са здымка
Ў гімнасцёрцы такой,
Што насіў у вайну,
З земляком-сябруком
У салдацкім абдымку,–
Фота ў рамцы разной
Дзед змясціў на сцяну.

Гімнасцёрку пасля
Ў хаце роднай пабачыў,
Калі бацька з вайны
Перамогу прынёс.
Шчасце біла праз край,
Аршалася плачам,
Не саромеўся род
Тады радасных слёз.

Мой хлапечы пагляд
Згледзеў зорку на шапцы,
Гімнасцёркі рукаў,
Што ля дзіркі зрыжэў.
І не знаў я, малы,
Што было мала шанцаў
Паглядзець на мяне,–
Бой быў цяжкі за Ржэў.

...Разумею цяпер
Я салдат-ветэранаў,
Калі форму сваю
З той вайны берагуць –
Сведку жорсткіх баёў,
Перамог не экранных,
Калі з крыкам «ура»
У атаку ўстаюць...

## З ІХ ПІСАЦЬ БЫ АБРАЗЫ...

Не модна мой радок гучыць,
Ды як жа з памяці мне сцерці
У плуг запрэжаных жанчын,
На полі бой з галоднай смерцю?

Былі ж прыкметаю гадоў
Пустыя свірны і кадушкі,
І слёзы горкія ўдоў
Хавалі мокрыя падушкі.

Худыя дзеці, нібы цень,
У маці лустачку прасілі.
Пусты ж не песціў працадзень,
Трывалі ўдовы, што ёсць сілы.

Жылі суседзі, бы радня,
Адзінай, дружнай талакою.
Была ж у сэрцах дабрыня,
Цяпер не стрэнешся з такою.

Зярняты сеялі вясной
І жыта жалі гуртам, з песняй.
Яе вяртае памяць зноў,
Як чую птаха ў паднябессі.

…Душа бабуль – чысцей расы,
Хоць моц і спрыт ужо не тыя.
З бабуль пісаць бы абразы
За справы іхнія святыя.

## НА МОГІЛКАХ

Магіл фарбую агароджы.
Блакіт кладзецца на крыжы.
Жыццё зямное, як дар Божы,
Мой род у клопатах пражыў.

Карэнні радавога дрэва…
Куды ні глянь: груды, груды…
Самотна ціша ля іх дрэмле,
Ля кветак толькі чмель руды.

Сумуе стромкая бяроза.
Вясной блакіт раскіне бэз.
Святое месца – пры дарозе,
Дзе рэчкі стужка, луг і лес.

Парой асенняй неба клінам
Расколе вырай жураўлёў
І скіне скаргу дзеду Кліму
З балот асушаных без слоў.

Лістоў зжаўцелыя аладкі
Прымае могілак трава.
Бабуля спіць мая Паладка –
Умела смерць сыноў трываць.

А побач бацька з маці тута,
Сястра малодшая і брат.





Трывожны чую сэрца грукат,
Зямля спяшыла іх забраць.

Фарбую моўчкі агароджы.
Блакіт кладзецца на крыжы.
Навокал дзень плыве прыгожы,
Ды смутку горыч на душы.

І слёзы высахлі. Не плачу.
Жыцця майго вузее шлях.
Раблю магілам справаздачу
Аб справах добрых і грахах.

***

Зноў журбою на струнах дажджоў
Зацягнулася восені песня,
І на крылах кліны жураўлёў
Радасць цёплую ў вырай панеслі.

І звіняць звонкай меддзю лісты
Па-над сцежкамі ў вальсе апошнім,
А туман абдымае густы
Схаладнелую, рыжую пожню.

І зайздросціць кастрам пастухоў,
Дзе пахучая бульба пячэцца
Нават сонца. Яно раніцой
І не супраць само пагрэцца.

## ЖНІВО

*Памяці маці*

Сінь нябёсаў бязмежна разліта.
Жнівень спелую дорыць красу.
Я – малы – сцежкай цупкай праз жыта
Паркалёвы вузельчык нясу.

Ад такога даверу шчаслівы –
У руках для матулі абед.
Б'е паклоны сярпом яна ніве
У чародцы вясковых кабет.

Калі ж сонца зачэпіць узлессе,
Доўгі цень зашарэ ў траве,
Надвячоркам народзіцца песня
І над полем яна паплыве.

…Мамы дні прамільгнулі, як знічкі.
Серп сумуе ў закутку двара.
Перапёлка ж, як некалі, кліча:
«Жаць пара!.. Жаць пара!.. Жаць пара!..»

## САЛАМАРЭЗКА

*Памяці першых гомсельмашаўцаў*

Гляджу на здымак саламарэзкі,
З якой завод гісторыю вядзе,
І з першай параўнаць хачу пралескай,
Што цягнецца да сонца ў вясні дзень.

Хоць першым прабівацца ў людзі цяжка,
Ды ўсё ж надзея светлая жыла.
Былі не ў модзе льготы і паблажкі,
Да поту праца моднаю была.

Чакала вёска помачы рабочых
Пад нізкаю страхой замшэлых хат.
І цэхі не сціхалі ўдзень і ўночы, –
Быў гордасцю няхітры агрэгат.

І хоць адпраўлены ў музей ён часам,
Дзе гаспадарыць толькі цішыня,
Ды злучаны навек нябачным пасам
З «Палессем» слаўным сённяшняга дня.

***

Месяц зоры збірае на веча.
Ноч на лодцы яго прыплыве.
Сож малітву вячэрнюю шэпча,
Адбівае паклоны траве,
Што прыбегла вясною пагрэцца
І жыве ля гаючай вады.
Салаў'і шчодра радуюць сэрца,
Льюцца спеваў каленцы-лады.
Адзінокі ліхтар жоўтай бэрай
Ля прычалу павіс ўгары.
Хвалі шчыра цалуюць свой бераг
Покуль барва не ўспыхне зары.
Сож тады скіне коўдру туману.
Ранак мыцца сюды прыбяжыць.
Першы промень стралою зламанай
Згубіць след у падводнай цішы.





***

Пражыты дзень –
Касцёр патухлы,
Які аддаў спаўна цяпло.
…Халодны вокам месяц круглы
Глядзіць на соннае сяло.

Іду запозна каля рэчкі.
Ачах туману сырадой.
П'ю водар дзікае парэчкі,
Што густа льецца над вадой.

Вярба лапоча тут аб нечым.
Дзяркач не змог начлег знайсці.
…А роздум доўжыцца аб вечным
І Богам дадзеным жыцці.

***

Нашто лічыць пражытыя гады,
З нябыту іх ніхто не верне?
Пакуль жывеш – гадуй дзяцей, сады
І дабрыні сей шчодра зерне.
Калі збяжыць жыццё, нібы вада
Нашчадак, можа, светла ўспомніць
І гэта будзе лепшы помнік
Тваім турботным на зямлі гадам.